**Пад лупаю апынуцца грамадзяне, якія набылі ў банках вялікую суму замежнай валюты**

**Маладыя беларусы просяць Эўропу не размаўляць з Лукашэнкам за сьпінай апазыцыі**

**Беларускі каталіцкі касьцёл ня вырашыў праблемы папаўненьня колькасьці сьвятароў грамадзянамі Беларусі**

**Беларуская апазыцыя шукае шляхі выйсьця зь фінансавага крызысу**

**Сідорскі заўважыў крызыс**

**На «Эўрабачаньне» патрапіць беларускамоўная песьня?**



photo.bymedia.net

1 сьнежня павінен быў адбыцца Вышэйшы дзяржаўны савет Саюзнай дзяржавы (ВДС СД), прычым абодва бакі падсілкоўвалі чаканьні публікі намёкамі на нейкую лёсавызначальнасьць рашэньняў, якія на ім будуць прынятыя. Мерапрыемства давялося перанесьці, у чым бакі абвінавацілі адно аднога. ВДС тым ня менш павінен адбыцца да канца сьнежня і вызначыць фармат адносінаў дзьвюх краінаў на 2009 г. Аднак перанос паседжаньня і яго прычыны сьведчаць пра тое, што фармат адносінаў краінаў-удзельніц СД у 2009 г. застанецца «прамежкавым».

Расейскі бок чакаў ад ВДС трох «лёсавызначальных» рэчаў:

- Публічнай заявы пра тое, што першы крок да інтэграцыі фінансавых сыстэмаў дзьвюх краінаў зьдзейсьніўся – менавіта ў такім ключы расейскае кіраўніцтва зацікаўленае падаць згоду Беларусі на аплату расейскіх энэрганосьбітаў расейскімі рублямі. Нягледзячы на тое што па сутнасьці праект трансфармацыі расейскага рубля ў рэгіянальную рэзэрвовую валюту, у рамках якога дасягнутая дамоўленасьць зь Беларусьсю пра пераход на аплату расейскіх энэрганосьбітаў расейскімі рублямі, замяшчае стары праект адзінай валюты Саюзнай дзяржавы («рубель – рэзэрвовая валюта» хаця і зьяўляецца больш амбіцыйным плянам, для Беларусі значна больш бясьпечны, чым «рубель – адзіная валюта СД», паколькі захоўвае свабоду ў пытаньнях эмісіі і фінансавай палітыкі), расейскаму кіраўніцтву патрэбныя пацьверджаньні трываласьці расейскай фінансавай сыстэмы, захаваньня даверу да рубля і веры ў яго пэрспэктывы.

- Падпісаньня дамовы па сумеснай супрацьпаветранай абароне – перамовы пра гэта цягнуцца ўжо прынамсі шэсьць гадоў, і беларускі бок, ня маючы пярэчаньняў у прынцыпе, пастаянна адкладае канчатковае рашэньне. Прычыны нясьпешнасьці беларускага боку ў гэтым пытаньні прыкладна тыя ж, што і прычыны, па якіх не падпісваецца «ўжо зусім гатовы» Канстытуцыйны акт СД: немагчымасьць забясьпечыць раўнапраўе бакоў у працы «каманднага пункту».

- Пацьверджаньня саюзьніцкіх абавязальніцтваў Беларусі, то бок узгадненьня замежнай палітыкі, дзе прыватным пытаньнем

выступаюць праблема прызнаньня Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі, а таксама забесьпячэньне доступу расейскага боку да інфармацыі пра ходу дыялёгу Беларусі і Эўрапейскага Зьвязу.

Важна пры гэтым адзначыць, што расейскі бок перакананы ў тым, што ўжо заплаціў за згоду Беларусі па ўсіх трох пунктах, а таму не клапоціцца пра дадатковую пазытыўную матывацыю для беларускага кіраўніцтва. Па першым пункце – расейскім крэдытам, па другім – пераўзбраеньнем беларускай арміі па «ўнутраных» расейскіх коштах, па трэцім – усёй гісторыяй двухбаковых адносінаў, то бок шматгадовай падтрымкай Беларусі на міжнароднай арэне і фінансава-сыравіннай падпіткай яе эканомікі. Таму расейскі бок ня схільны пытаньні коштаў на сыравіну і да таго падобныя ставіць у залежнасьць ад дамоўленасьцяў па гэтых трох пунктах.

Беларускі бок лічыць, што станоўчы адказ на расейскія ініцыятывы павінен суправаджацца дадатковымі бонусамі, прычым вельмі і вельмі істотнымі. На тле падаючай кан'юнктуры коштаў на расейскія энэрганосьбіты і агульных (на тле ўсясьветнага фінансавага крызысу) праблемаў расейскай і беларускай эканомікаў, беларускае кіраўніцтва лічыць цалкам натуральным, калі згода ці нават абяцаньне згоды па двух пунктах расейскай павесткі будзе ўзнагароджаная вяртаньнем да фармату дачыненьняў да 2007 г. у пытаньнях пастаўкі энэрганосьбітаў.

У адказ расейскі ўрад у асобе У. Пуціна прыняў нарэшце рашэньне пра пачатак будаўніцтва БТС-2 і распаўсюдзіў у СМІ паведамленьні высокапастаўленых ананімаў пра тое, што дачыненьні зь Беларусьсю ў пытаньнях паставак газу і нафты перагляду не падлягаюць.

Калі расейскі бок ня пойдзе на саступкі ў гэтых пытаньнях, цяжка чакаць, што беларускі пагодзіцца на расейскія прапановы (акрамя пераходу на аплату газу і нафты ў рублях – паколькі гэта ўмова атрыманьня другой траншы расейскага крэдыту).

А пакуль, 9 сьнежня адбыўся незаплянаваны візыт Лукашэнкі ў Маскву, дзе ён узяў удзел у пахаваньні патрыярха Маскоўскага і Ўсёй Русі Алексія ІІ. Ніякай канфідэнцыйнай камунікацыі падчас гэтага візыту ў Лукашэнкі з расейскім калегам не было. Можна адзначыць, што апошні пастырскі візыт патрыярха адбыўся ўвосень менавіта ў Беларусь.

У Беларусі пэўны рэзананс атрымалі заявы наконт ідэі «Ўсходняга партнэрства», якія прагучалі з Брусэлю. Як ні дзіўна, але на ідэю «Ўсходняга партнэрства» афіцыйны Менск адрэагаваў цалкам пазытыўна. У беларускім МЗС, у прыватнасьці, заявілі, што Беларусь расцэньвае ініцыятыву «Ўсходняга партнэрства» як «прагматычны крок Эўразьвязу па нарошчваньні прагматычнага супрацоўніцтва з краінамі свайго бліжэйшага атачэньня». МЗС выказаў зацікаўленасьць у пашыраным супрацоўніцтве з ЭЗ па шэразе ўзаемавыгодных кірункаў, уключаючы гандаль, энэргетыку, транспарт, барацьбу з транспамежнай злачыннасьцю, экалёгію і сельскую гаспадарку. Кіраўніцтва Беларусі лічыць, што «Ўсходняе партнэрства» магло б стаць плятформай для ажыцьцяўленьня ў шматбаковым рэгіянальным фармаце некаторых з тых праектаў, абмеркаваньне якіх ужо вядзецца ў межах бягучых галіновых перамоваў між Беларусьсю і ЭЗ. У сваю чаргу кіраўнік офісу Эўракамісіі ў Беларусі Ж.-Э. Хальцапфэль нагадаў, што, перш чым Беларусь змажа падпісаць пагадненьне пра асацыяцыю з ЭЗ у межах «Усходняга партнэрства», яна павінна заключыць з Эўразьвязам пагадненьне пра супрацоўніцтва і партнэрства, якое «распрацоўвалася, але было замарожана ў 1995 годзе». На яго думку, ключавымі момантамі для прыняцьця рашэньня пра канчатковую адмену санкцыяў і разьвіцьцё супрацоўніцтва для ЭЗ зьяўляюцца 5 з 12 пунктаў, акрэсьленых у межах палітыкі партнэрства.

На думку шэрагу назіральнікаў, нават пры наяўнасьці вялікага жаданьня стаць паўнапраўным чальцом «Усходняга партнэрства» Беларусі будзе вельмі няпроста ажыцьцявіць гэты праект на практыцы. Аднак іншага выбару, акрамя эўрапейскага, у яе проста няма.

А тым часам, 4 сьнежня Аляксандар Лукашэнка на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім і кіраўніком Нацыянальнага банку Беларусі Пятром Пракаповічам абмаляваў контуры эканамічнай і сацыяльнай палітыкі ў цяперашніх умовах, падкрэсьліўшы пры гэтым, што ў Беларусі няма крызысу і быць яго ня можа, але трэба ўсё роўна «рыхтавацца да горшага» – на ўсялякі выпадак.

Экспэрты адзначаюць, што за студзень-кастрычнік у эканоміцы Беларусі назіраецца падзеньне тэмпаў вытворчасьці і інвэстыцыяў

разам з паслабленьнем спажывецкага попыту.

У кастрычніку 2008 г. у параўнаньні зь верасьнем аб’ём вырабленай прамысловай прадукцыі (працаў, паслугаў) скараціўся ў супастаўляльных коштах на 2,9%. Прычым у асобных рэгіёнах сытуацыя выглядае яшчэ горш: Гарадзенская вобласьць – мінус 10%, Віцебская – мінус 7,3%, Менская – мінус 5,9%, Гомельская вобласьць – мінус 2%.

Сярод галінаў прамысловасьці безумоўным лідэрам падзеньня зьяўляецца чорная мэталюргія – мінус 23,7% у кастрычніку ў параўнаньні зь верасьнем (у супастаўляльных коштах). У тым ліку вытворчасьць пракату чорных мэталаў скарацілася адразу на 35,9%.

Разам з тым стан дзяржаўных фінансаў у бягучым годзе захоўваецца стабільным. Больш за тое, па выніках трох кварталаў 2008 г. кансалідаваны бюджэт Беларусі выкананы з прафіцытам Br4,943 трлн., што складае 5,3% да ВУП. За студзень-верасень 2007 г. прафіцыт кансалідаванага бюджэту складаў Br2,728 трлн., ці 3,9% да ВУП.

Экспэрты лічаць, што ў дадзеных умовах ураду і Нацыянальнаму банку было б мэтазгодна скарэктаваць курс нацыянальнай валюты – у першую чаргу для падтрымкі экспартэраў.

Акрамя таго, экспэрты рэкамэндуюць зьнізіць падатковую нагрузку, увесьці льготныя працэнтныя стаўкі для рэальнага сэктару, спрасьціць сыстэму падатковага і бухгальтарскага ўліку і справаздачнасьці, а таксама скараціць шэраг адміністрацыйных працэдураў.

На дадзенай сустрэчы з кіраўнікамі ўраду і Нацыянальнага банку Лукашэнка распарадзіўся: не зьніжаць тэмпы росту вытворчасьці, не скарачаць пэрсанал прадпрыемстваў, распрадаць усе рэшткі на складах, а ўсіх тых, хто не сумее справіцца зь яго заданьнямі, прыгразіў звольніць ці пакараць неяк іначай.

Разам з тым урад дазволіў прадпрыемствам прадаваць прадукцыю ніжэй за сабекошт. Праўда, працэдура такіх продажаў вельмі складаная, і невядома яшчэ, ці ня стане пасьля Камітэт дзяржаўнага кантролю кваліфікаваць такія продажы як крымінальныя злачынствы.

Акрамя таго, урад зьнізіў заробкі бюджэтнікам пасьля лістападаўскага падвышэньня. Некаторыя прадпрыемствы выпраўляюць сваіх працаўнікоў у адпачынкі за свой кошт – прынамсі на час калядных вакацыяў, іншыя прадпрыемствы – скарачаюць працоўны тыдзень. Аднак сыстэмных мераў па паляпшэньні стану рэальнага сэктару і эканомікі ў цэлым пакуль не назіраецца.

Варта адзначыць, што місія МВФ для працягу перамоваў з урадам і Нацбанкам прыедзе ў Менск 15 сьнежня 2008 г. У цяперашні час дакладная дата завяршэньня перамоваў пра вылучэньне рэзэрвовага крэдыту stand-by на суму USD2 млрд. пакуль невядомая.

Важнай падзеяй у Беларусі можа стаць дазволенае ўладамі правядзеньне 15 сьнежня ў Менску акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, якія патрабуюць адмены новых правілаў увозу прадукцыі ў Беларусь з 2009 году. Напярэдадні ў Менску адбыўся круглы стол, прысьвечаны праблемам і пэрспэктывам дробнага бізнэсу ў Рэспубліцы Беларусь. Адным зь яго арганізатараў быў намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка.

«Калі выйдзе 10 тыс. чалавек, то гэта будзе вельмі моцна, і назаўтра ўсе пытаньні будуць вырашаныя», – упэўнены адзін зь лідэраў прадпрымальнікаў Анатоль Шумчанка. Ён зьвярнуўся да апазыцыі з просьбай не прыносіць на акцыю пратэсту ІП 15 сьнежня сваю атрыбутыку. Паводле Шумчанкі, сьцягі і




плякаты апазыцыі не адпавядаюць мэтам маршу ІП, якія маюць «выключна эканамічны характар».

АФІЦЫЙНА

## Пад лупаю апынуцца грамадзяне, якія набылі ў банках вялікую суму замежнай валюты

***Сума акрэсьліваецца прыкладна ў 16 тысяч даляраў – гэта тысяча базавых велічынь. Згодна зь беларускім заканадаўствам, набыцьцё вялікай сумы валюты павінна быць занесенае ў дэклярацыю.***

У банках супакойваюць, што дадзеныя асобы, якая набывае больш за 16 тысяч даляраў, будуць захоўвацца ў банках і ня будуць перададзеныя далей. У практыцы, аднак, гэтая інфармацыя трапляе ў падаткавую інспэкцыю, а



photo.bymedia.net

ўладальнік «круглай» сумы даляраў павінен патлумачыць, за якія сродкі ён набыў валюту.

ПАЛІТЫКА

## Маладыя беларусы просяць Эўропу не размаўляць з Лукашэнкам за сьпінай апазыцыі

***Актывісты моладзевых беларускіх арганізацыяў нагадалі Далай-ламе, Леху Валэнсе і Радаславу Сікорскаму пра сапраўдную палітычную сытуацыю ў Беларусі. Казалі пра палітвязьняў у краіне, прасілі падтрымаць Аляксандра Баразенку ды імкнуліся данесьці свой пункт гледжаньня адносна наладжваньня кантактаў з рэжымам Аляксандра Лукашэнкі.***

Яўген Афнагель, лідэр кампаніі «Джынс за свабоду»: «Мы адзначылі, што вельмі важна, каб эўрапейскія палітыкі не вялі кулюарных перамоваў з рэжымам Лукашэнкі за сьпінай апазыцыі. Мы лічым, што весьці перамовы з рэжымам Лукашэнкі цяпер небясьпечна й нельга, таму што ніводнае патрабаваньне Эўропы фактычна ня выкананае. У нас да гэтага часу ёсьць палітвязьні, адсутнічае свабода СМІ, пра свабодныя выбары няма чаго й казаць».

Яўген Афнагель – удзельнік канфэрэнцыі «Салідарнасьць дзеля будучыні», якая 5–6 сьнежня праходзіла ў Гданьску й была прымеркаваная да 25-годзьдзя прызнаньня былому польскаму прэзыдэнту Леху Валэнсе Нобэлеўскай прэміі ў галіне міру. На сустрэчы ў Гданьску былі таксама Аляксандар Атрошчанкаў і Павал Юхневіч з «Эўрапейскай Беларусі», лідэр «Маладой Беларусі» Артур Фінькевіч й лідэр «Моладзі БНФ» Франак Вячорка.

ГРАМАДЗТВА

## Беларускі каталіцкі касьцёл ня вырашыў праблемы папаўненьня колькасьці сьвятароў грамадзянамі Беларусі

***Пра гэта заявіла Марына Цьвік, начальнік аддзелу па справах рэлігіі. У Беларусі дзейнічаюць толькі дзьве каталіцкія сэмінарыі, навучаньне ў якіх цягнецца 6 гадоў, а каталіцкі касьцёл актыўна запрашае на працу замежных грамадзянаў.***

Словы Марыны Цьвік перадае дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БелТА. Запрошаныя сьвятары вельмі часта не валодаюць дзяржаўнымі мовамі Беларусі й прасоўваюць іншую культуру й мэнталітэт, а таксама не заўсёды разумеюць сацыяльна-палітычныя працэсы ў краіне.

Марына Цьвік таксама адзначыла, што ў 2008 годзе касьцёл усё ж запрасіў на працу на 14 замежных сьвятароў менш, чым у папярэднія гады. Яна нагадала, што сьвятары-замежнікі павінны атрымліваць асабісты дазвол на працу ад упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў.

АПАЗЫЦЫЯ

## Беларуская апазыцыя шукае шляхі выйсьця зь фінансавага крызысу

***Нацыянальны камітэт АДС, навукова-дасьледніцкі цэнтар Мізэса й аналітычны цэнтар «Стратэгія» бліжэйшымі днямі агучаць вынікі супольнай працы над гэтай праблематыкай.***

Кіраўнік працоўнай групы «Праграма па выхадзе з крызысу» Яраслаў Раманчук адзначае адмоўныя працэсы: спыненьне інвэстыцыйных праектаў на будучы год, рост інфляцыі, зьмяншэньне заробкаў і пэнсій.

На думку эканаміста, беларускі ўрад ня мае ідэяў, як выйсьці з крызысу, а прынамсі, як зьменшыць яго адмоўныя наступствы на беларускую эканоміку. Працоўная група «Праграма па выхадзе з крызысу» пры АДС адзначае, што неабходна тэрмінова прыняць адказныя й слушныя рашэньні. Для гэтага ўлада павінна прыслухацца да рэкамэндацыяў незалежных эканамістаў.

ЭКАНОМІКА

## Сідорскі заўважыў крызыс

***Прэм’ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі канстатуе ўзмацненьне ўплываў усясьветнага фінансавага крызысу на эканоміку Беларусі, а таксама падкрэсьлівае неабходнасьць прыняцьця радыкальных антыкрызысных мераў.***

«На жаль, крызыс ахоплівае ўсё больш дзяржаваў, а яго ўплыў на эканоміку Беларусі ўзмацняецца. Улічваючы, што нашая эканоміка арыентаваная на экспарт, крызыс уплывае на найважнейшыя галіны», – словы Сідорскага цытуе агенцтва «Інтэрфакс».

Па словах прэм’ер-міністра, у першую чаргу трэба ашчадзіць рэсурсы, аднак адначасова неабходна захаваць канкурэнтаздольнасьць беларускіх экспартэраў на традыцыйных рынках. Сяргей Сідорскі падкрэсьліў неабходнасьць пошуку новых рынкаў збыту беларускіх тавараў.

Як паведаміў беларускі прэм’ер, «з мэтаю мінімалізацыі наступстваў усясьветнага крызысу распрацаваны комплекс мераў па забесьпячэньні эканамічнай бясьпекі». У прыватнасьці, Сяргей Сідорскі адзначыў рашэньне пра дзяржаўную падтрымку банкаўскай сыстэмы, магчымасьць фармаваньня экспартных цэнаў, а таксама пляны ўраду прыняць аналягічныя рашэньні пры рэалізацыі тавараў на ўнутраным рынку.



КУЛЬТУРА

## На «Эўрабачаньне» патрапіць беларускамоўная песьня?




***Сьпявачка Дакота, адзіная прэтэндэнтка зь песьняй на беларускай мове, патрапіла ў паўфінал нацыянальнага адбору.***

Змаганьне за пуцёўку на конкурс сьпеваў «Эўрабачаньне» ў Беларусі працягнуць 15 чалавек. Адбылося адборышча, дзе прафэсійная камісія вылучыла са 118 прэтэндэнтаў на ўдзел 15 асобаў, якія патрапілі ў паўфінал нацыянальнага адбору. Гэтыя сьпевакі будуць змагацца далей, а ў студзені зь іх выберуць усяго 5 чалавек для фіналу. У фінале нацыянальнага адбору адбудзецца галасаваньне гледачоў, якое далучаць да меркаваньня журы ды вызначаць пераможцу.

Прыемная вестка, што ў паўфінал патрапіла сьпявачка Дакота – адзіная са 118 канкурсантаў, хто засьпяваў на адборы па-беларуску. Кіраўнік «Эўрафэсту» Аляксандар Ціхановіч ухваліў выбар сьпявачкі ды прывёў цікавую статыстыку. Конкурс «Эўрабачаньне» адбываўся ўжо 52 разы. Зь іх 22 разы перамагала песьня на ангельскай мове, а астатнія 30 – сьпевы на нацыянальных мовах. Гэткім чынам, паводле статыстыкі, беларускамоўная песьня будзе мець болей шанцаў!

Сьпявачка Дакота, якая жыве ў Менску, стала вядомай пасьля таго, як пасьпяхова ўдзельнічала ў расейскім супэршоў «Фабрыка зорак», дзе на вачах у гледачоў прафэсіяналы ад музыкі вучылі звычайных юнакоў ды дзяўчат сьпяваць і трымацца на сцэне.

Калі Дакоце прапанавалі пазмагацца за пуцёўку на «Эўрабачаньне», яна заняла прынцыповую пазыцыю, каб песьня была на роднай мове.

Ці дапаможа мова продкаў маладой амбіцыйнай сьпявачцы, даведаемся ў студзені.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.